Революция у Бунина расширяется до пределов целого мира, занимает весь мир. Она несет смерть, а не жизнь, и даже весеннее пробуждение природы не может ничего изменить к лучшему: ***Но зияла в мире необъятная могила. Смерть была в этой весне, последнее целование*** (2, с. 378). Недаром в исследованиях советских литературоведов «Окаянные дни» характеризуются как пасквильная книга (3, с. 32), книга, которая находится за гранью искусства (3, с. 35), говорится о том, что «всё светлое будущее для Бунина было далеко позади – в расплывчатых и абстрактных идеалах патриархальной жизни» (3, с. 34). Как видно, особенности мировосприятия писателя, вместе со своеобразием его идиостиля, обусловливают специфику вербализации концепта *революция* в хронике «Окаянные дни».

ЛИТЕРАТУРА

1 Ожегов, С. И. Словарь русского языка / Под ред. Н.Ю.Шведовой / С. И.Ожегов. – М.: Русский язык, 1986. – 797 с.

2 Бунин, И. А. Жизнь Арсеньева. Окаянные дни / И. А. Бунин. – М.: АСТ: ЛЮКС, 2005. – 444 с.

3 Андреев, Ю. А. Революция и литература: Октябрь и гражданская война в русской советской литературе и становление социалистического реализма (20-30-е годы) / Ю. А. Андреев. – М.: Худож. лит., 1987. – 399 с.

***А. М. Палуян***

## МАСТАЦКІЯ І ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫЯ ТЭКСТЫ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Вывучэнне беларускай мовы студэнтамі нефілалагічных факультэтаў з’яўляецца адной з умоў фарміравання іх светапогляду, ключом да назапашанай стагоддзямі народнай культуры, незаменным сродкам захавання традыцый і пераемнасці пакаленняў. Веданне роднай мовы – паказчык высокай адукаванасці і культуры.

Для таго каб зацікавіць студэнтаў, неабходна выкарыстоўваць разнастайныя метады і прыёмы навучання беларускай мове. Адзін з найбольш актуальных – лінгвакультуралагічны метад, які арыентуе выкладчыка пры адборы дыдактычнага матэрыялу на тэксты, якія б адлюстроўвалі гісторыю Беларусі, нацыянальныя традыцыі беларускага народа, асаблівасці яго побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Мастацкая літаратура ўздзейнічае як на розум, так і на пачуцці чалавека, дае матэрыял для пазнання жыцця і фарміравання светапогляду чалавека, развівае фантазію асобы, яе творчыя здольнасці. Творы сапраўдных майстроў слова робяць велізарны ўплыў на свядомасць чалавека, надоўга застаюцца ў памяці, таму відавочнай з’яўляецца неабходнасць іх выкарыстання на занятках.

Цяжка пераацаніць ролю мастацкай і публіцыстычнай літаратуры ў патрыятычным выхаванні, у выніку якога студэнты авалодваюць аб’ектыўнымі звесткамі па гісторыі і культуры свайго краю і народа, асэнсоўваюць характар, паводзіны і дзейнасць прадстаўнікоў сваёй нацыі. Успрымаючы веды, чалавек успрымае і ідэі, этычныя ідэалы, жыццёвыя ўстаноўкі.

Адна з асноўных мэт курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» – развіццё навыкаў вуснага маўлення. Студэнтам прапаноўваецца шырокая тэматыка вусных выказванняў, якая ахоплівае гісторыю і этнаграфію беларусаў, нацыянальны характар, матэрыяльную і духоўную культуру, асвету, навуку, мастацтва і інш. Выкарыстанне мастацкіх і публіцыстычных твораў пры абмеркаванні такіх тэм дазволіць павысіць эфектыўнасць і цікавасць заняткаў, а літаратурныя тэксты даюць найбагацейшы і найкаштоўнейшы матэрыял для такой працы.

Сучасная методыка выкладання беларускай мовы патрабуе, каб граматычныя заданні былі пабудаваны на аснове тэкстаў. Правільны, граматны падбор тэкстаў дазваляе спалучыць эфектыўную працу па засваенні вучэбнага матэрыялу з выхаваннем. Тэксты павінны быць

змястоўнымі і накіраванымі на развіццё нацыянальнай свядомасці студэнтаў. І тут мастацкая літаратура з'яўляецца незаменнай крыніцай для падбору тэкстаў і складання дыдактычных заданняў. Вельмі важна падбіраць матэрыял такім чынам, каб ён быў звязаны з тэмамі вусных выказванняў. Гэта дазволіць лагічна і паслядоўна перайсці ад граматычных заданняў да вуснага абмеркавання той ці іншай тэмы, звязаць часткі ў адзінае цэлае.

Напрыклад, на занятках па беларускай мове можна прапанаваць наступныя заданні:

1) спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары: *Хаджу каля Свіслачы па адроджаным Траецкім пра...месці, нібы завіта... у колішні Мінск з шынкамі і крамкамі, кавярнямі і кнігарняю «Вянок». А трошкі далей, з Траецкага ўзвы...а, вечна малады Максім ...глядае...а ў загус...елую с...нечу веснавога неба, дзе толькі што «Зорка ...енера ...зышла над з...млёю». І загучала м...лодыя. Няўжо галюцынацыя сл...ху? Не. У т..атры ідзе опера Семянякі і Бачылы пра н...згасную зорку Багдановіча. А праз вуліцу да вайны быў дом: ніз ц...гляны, верх з б...рвення, з вонкавай лесвіцай. У ім некалі гайдалася калыска мален...кага Максіма і гучала матч...на калыханка* (С.Грахоўскі).

Падрыхтуйце вусныя выказванні, прысвечаныя гісторыі і сучаснаму стану беларускага опернага мастацтва, жыццёваму і творчаму шляху М.Багдановіча.

2) прачытайце тэкст; выпішыце асобна па чатыры словы (у пачатковай форме), якія абазначаюць прадметы, дзеянні, прыметы прадметаў і прыметы дзеянняў; вызначце, якімі часцінамі мовы яны выражаны: *Час прасвятлення, як і эпоха Рэнесансу ў мінулым, узнімае на новую вышыню як грамадскую каштоўнасць чалавечую асобу – духоўна багатую, гарманічна развітую, самаахвярную. І акрамя сумы ведаў маладому чалавеку трэба браць у жыццёвую дарогу, каб не адстаць ад часу, разуменне сваёй лучнасці са светам, адчуванне яго вялікай гармоніі. Трэба вучыцца адчуваць сябе жывой часцінкай у гэтым свеце, творцай і свайго лёсу, і заўтрашняга дня грамадства.*

*Заканчваецца час бяздумных калёсікаў і вінцікаў – пачынаецца эра ўнутранай работы ў душы кожнага чалавека. Рана ці позна кожны зразумее вялікі (можа, касмічны) закон рэха: як ты ставішся да свету, да людзей – так і свет да цябе. Наш мудры, шматпакутны беларускі народ выкрышталізаваў гэту прапісную ісціну ў словах: як гукнеш – так і адклікнецца* (І.Ждановіч).

Ці згодны вы з аўтарам гэтых радкоў? Адказ абгрунтуйце.

3) вызначце, адназначныя ці мнагазначныя словы выдзелены ў тэксце. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам: *Мала знойдзецца на* ***свеце*** *народаў з такім трагічным* ***лёсам****, як беларусы. Да святла, да бацькаўшчыны, да саміх сябе цягам доўгіх стагоддзяў* ***прабіваліся*** *праз ману і здзекі, насмешкі і пагрозы, войны і эшафоты. Нам адмаўлялі ў* ***праве*** *мець свае ўласныя імёны – народа, бацькаўшчыны, ужываць* ***родную*** *мову, рабілі* ***манкуртамі****, апалячвалі і русіфікавалі, падзялялі рэлігіямі, мовамі, дзяржаўнымі межамі, ідэалогіяй. Народжаных на торным* ***шляху*** *з захаду на* ***ўсход****, паміж кавадлам Рэчы Паспалітай і молатам Расійскай імперыі, нас выбівалі ў войнах – ад чвэрці да паловы насельніцтва краю,* ***палавінілі****, чацвяртавалі ў імя «высокіх» іншадзяржаўных інтарэсаў,ператваралі ў лагерны пыл у ГУЛАГах і Картуз-Бярозах.*

*Сёння ... мы пачынаем ўсведамляць: калі не выстаім, не ўмацуемся як нацыя, народ – не застанемся на зямлі, не выжывем і фізічна* (В.Рагойша).

Аб якіх падзеях з гісторыі беларускага народа гаворыцца ў тэксце?

4) прачытайце тэкст ; выпішыце назоўнікі, якія абазначаюць жывыя істоты; вызначце сінтаксічную ролю назоўнікаў:

*Прапахла паветра бензінам, саляркаю, газам,*
*Аж моташна ліпам, каштанам, бярозам і вязам.*
*Ад сіняга дысу ссыхае сасна за сасною,*
*Іх рэжуць на дровы і ў шуркі складаюць вясною.*
*Даўно пазнікалі з зялёнае паркавай зоны*
*Дразды, вераб'і, салаўі і вароны.*
*Закураны пылам прамытыя з раніцы шыбы,*
*Прапахлі мазутам злінялыя сонныя рыбы.*
*Пацягне ад комінаў ветрыкам слабым –*

*І ў сажалцы ўжо задыхаюцца жабы.*
*На яблынях веццё ўвесну пасыпана густа*
*Забойнаю дозай атрутнага дусту,*
*І сад у зняменні глядзіць невясёлы,*
*Як з кветак на дол асыпаюцца пчолы.*
*Радзеюць гаі, пералескі, прысады і пушчы,*
*І толькі яшчэ чалавек застаецца трывушчы:*
*Ён дыхае дымам, аглушаны звонам і гудам,*
*І дзівіцца сам, што трымаецца цудам*

(С.Грахоўскі)

Падрыхтуйцеся да абмеркавання тэмы «Узаемадзеянне чалавека і навакольнага свету».

5) спішыце тэкст; агульныя назоўнік падкрэсліце хвалістай лініяй, уласныя – прамой; растлумачце правапіс выдзеленых слоў: *Імя Францыска Скарыны* ***свяціла*** *нашаму народу надзеяй і верай у самыя* ***цяжкія*** *часіны беларускай гісторыі. На працягу стагоддзяў нечуваны здзек трывала Беларусь: была радзімай* ***ўсходнеславянскага*** *кнігадрукавання і не мела права выдаваць кнігі на роднай мове. Яе слова заганялі ў рукапіс то польскае панства, то царскае* ***самадзяржаўе****. Нашу мову не проста прыгняталі, як, скажам, грузінскую, армянскую, літоўскую і іншыя, а* ***адмаўлялі*** (А. Клышка).

Падрыхтуйце вусныя выступленні аб развіцці кнігадрукавання на беларускіх землях і беларускіх кнігадрукарах.

6)спішыце сказы, раскрываючы дужкі і выбіраючы патрэбную форму займенніка; растлумачце правапіс займеннікаў: *Кажуць: сам ад (сабе, сябе) не ўцячэш. А я ўсё баюся, каб не ўцячы ад (самага, самога) (сабе, сябе), бо цяжка быць (самым, самім) сабою і так лёгка стаць (некім, нікім), без свайго вобліку, без характару – як усе, як (ніхто, нехта)* (Я.Брыль).

Як вы разумееце выказванне Янкі Брыля?

7) прачытайце верш; вызначце, займеннікі якіх разрадаў ужываюцца ў тэксце:
*Адзін крок – ад мяне да цябе.*
*Як шмат – адзін крок… Не пераадолець.*
*Не ўзяць далонь тваю ў рукі,*
*Не прыціснуць да вуснаў.*
*Што змянілася?*
*Нічога не змянілася.*
*Ты зрабіла крок назад: усяго адзін крок.*
*Мне не зрабіць крок да цябе: сцяна.*
*Я размаўляю з табой, ты мне*
*Ўсміхаешся.*
*Такая ж блізкая. Адзін крок.*
*Адзінае выратаванне: верыць, што*
*Калі-небудзь ты зробіш адзін крок –*
*Насустрач*

(В.Слінко «Апошні снег»)

8) прачытайце тэкст; знайдзіце ў ім часціцы, вызначце іх ролю ў паэтычным тэксце:
*Я прачытала, што ў адной краіне,*
*Утульнай і дагледжанай надзіва,*
*Амаль што кожны горад – нейкі помнік*
*І кожнае сяло славута замкам.*
*І ўся яна для свету дарагая,*
*Уся яна – нібы музей выдатны,*
*Дзе самыя шумлівыя турысты*
*Перад красой спрадвечнаю цішэюць…*
*А як жа ты, мая зямля-радзіма,*
*А дзе твае стовежавыя замкі?*

*Ці ж іх мае прапрадзеды сівыя,*
*Умельцы-мудрацы не будавалі?*
(Е.Лось)

Падрыхтуйце мультымедыйную прэзентацыю «Турыстычнымі шляхамі Беларусі».

9) спішыце тэкст, паставіўшы неабходныя знакі прыпынку: *Вазьміце атлас і прыгледзьцеся да карты паўднёваамерыканскай краіны Чылі. Бачыце: ля Ціхага акіяна там дзе да яго падступаюць магутныя вяршыні Андаў знаходзіцца горад Дамейка. А крыху паўночней – горны хрыбет які носіць тое ж імя. Геолагі могуць назваць мінерал батанікі – фіялку заолагі – малюска звязаных таксама з імем Дамейкі. Аднак мала хто ведае, што ўсё гэта і горад у далёкай краіне і горны ланцуг і кветка і мінерал і жывёліна названа так у гонар нашага земляка выдатнага рэвалюцыянера вучонага і падарожніка Ігната Дамейкі. Сын беларускай зямлі ён увайшоў у сусветную навуку пакінуў прыкметны след у розных галінах чалавечых ведаў мінералогіі і фізіцы хімііі і металургіі геаграфіі і батаніцы геалогіі і педагогіцы этнаграфіі і заалогіі.* (А.Мальдзіс).

10) перакладзіце тэкст на беларускую мову; растлумачце ўжыванне вялікай літары:

*Белорусские деятели внесли значительный вклад в культурное и революционное развитие далёких стран, лежащих на других континентах. Особо следует выделить Тадеуша Костюшко, отличившегося в войне за независимость в Северной Америке (1775 – 1783), которому было присвоено звание генерала, установлены памятники в Вашингтоне, Чикаго, Кливленде, Милуоки; его именем назван город в Австралийских Альпах – главная вершина материка.*

*В странах Дальнего Востока (Япония, Маньчжурия) известен талантливый дипломат, писатель, учёный (природовед, полиглот) Иосиф Гошкевич, оказавший большое влияние на культуру и государственную жизнь Японии, способствующий выходу страны из самоизоляции в мир западной цивилизации. В память о нём отмечаются юбилейные дни благодарной Японией.*

*Заметный след в естественных науках и экономической жизни Южной Америки оставил выдающийся учёный Игнатий Домейко. За большие заслуги перед Чили он был избран ректором Чилийского университета, объявлен национальным героем. Мировое признание его научных достижений нашло отражение в геологии, биологии, зоологии* (Е.Ширяев).

Падрыхтуйце вусныя выказванні пра Ігната Дамейку, Іосіфа Гашкевіча, Тадэвуша Касцюшку, Мікалая Судзілоўскага.

Мова мастацкіх і публіцыстычных твораў вядомых беларускіх аўтараў – найлепшы ўзор сапраўднай беларускай мовы, багатай, вобразнай, мілагучнай. Выкарыстанне такіх тэкстаў на занятках дазваляе развіваць інтэлект студэнтаў, уменне разважаць і аналізаваць, удасканальваць іх творчыя здольнасці, пашыраць кругагляд.

Сапраўдная літаратура заўсёды выхоўвае, фарміруе эстэтычны густ, развівае ўменне бачыць і адчуваць прыгожае, робіць чалавека духоўна багатай асобай. Такім чынам, творы мастацкай і публіцыстычнай літаратуры могуць з поспехам выкарыстоўвацца на занятках па беларускай мове.

***А. А. Станкевіч***

## ФІГУРЫ РАЗМЯШЧЭННЯ І ПЕРАСТАНОЎКІ ЯК СІНТАКСІЧНЫ СРОДАК ВЫЯЎЛЕНЧАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў МАСТАЦКІХ І ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ

Мастацкі тэкст, у адрозненне ад іншых функцыянальна-стылістычных разнавіднасцей маўлення, вызначаецца сваёй вобразнасцю, экспрэсіўнасцю і эмацыянальнасцю. У пэўнай ступені гэтыя якасці ўласцівыя і публіцыстычным тэкстам. Асноўную ролю ў экспрэсівізацыі маўлення адыгрываюць спецыяльныя сродкі выяўленчай выразнасці – тропы і фігуры.

У антычнай рыторыцы тэрмін фігура выкарыстоўваўся ў шырокім значэнні. Пад фігурай разумелі адхіленне ад звычайнага спосабу выражэння. Размежаванне тропаў і фігур не было дакладным і выразным. Тропы разглядаліся ў складзе фігур як фігуры думкі.